І. У. МАНДРЫК, М. С. СТАШКЕВІЧ

# ДА ПЫТАННЯ АБ СТВАРЭННІ АРГАНІЗАЦЫІ РСДРП(Б) НА ВІЦЕБШЧЫНЕ (люты — верасень 1917)

Пасля Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі бальшавікі Віцебскай губерні некаторы час знаходзіліся ў агульных арганізацыях з меншавікамі, эсэрамі і бундаўцамі. Гэта шкодзіла справе рабочага класа, у корані супярэчыла ленінскай стратэгіі і тактыцы партыі ў рэвалюцыі. 6 сакавіка 1917 года У. І. Ленін тэлеграфаваў бальшавікам, якія ад'язджалі з нейтральных краін у Расію, аб недапушчальнасці ніякага збліжэння з іншымі партыямі [1]. У пісьме да А. В. Луначарскага ён зноў падкрэсліў, што патрабаванне самастойнага існавання бальшавіцкай партыі, недапушчэнне ніякага збліжэння з іншымі партыямі для яго ўльтыматыўна. «Без гэтага дапамагаць пралетарыяту ісці цераз **дэмакратычны** пераварот да **камуны** нельга, а іншым мэтам служыць я не стаў бы»[2].

Што за прычыны аб'яднаўчых тэндэнцый, якія ўсё ж мелі месца? Яны разнастайныя. Галоўная з іх у тым, што ў гады вайны жорсткія паліцэйскія рэпрэсіі больш за ўсё цярпелі бальшавіцкія арганізацыі. Царызм імкнуўся пазбавіць рух кіраўніцтва, перашкодзіць бальшавікам узняць пралетарыят на актыўныя масавыя антываенныя выступленні.

Становішча ж віцебскіх бальшавікоў ускладнялася яшчэ шэрагам акалічнасцей: Віцебская губерня была прыфрантавой зонай. Арышты, высылкі найбольш вопытных, прайшоўшых ленінскую школу рэвалюцыянераў, у спалучэнні з мабілізацыяй рабочых у дзеючую армію, зрабілі становішча партыі тут надзвычай цяжкім; удзельная вага рабочага класа ў губерні была значна меншай, чым у прамыслова развітых цэнтрах Расіі і некаторых ускраінах.

Адзінай бальшавіцкай арганізацыі тады не было не толькі ў Віцебскай губерні, але, як піша адзін з арганізатараў Кампартыі Беларусі В. Кнорын, яе не было ўвогуле — на Заходнім фронце і ў Беларусі. Закінутыя ж вайной асобныя рэвалюцыйныя сацыял-дэмакраты да пачатку рэвалюцыі змаглі ўстанавіць толькі некаторыя асабістыя кантакты, але перайсці да работы па стварэнню арганізацыі яны не паспелі [3].

Да таго ж складанасць палітычнага становішча ў краіне, ціск дробнабуржуазнай стыхіі на рабочы клас, адсутнасць сувязі з кіруючымі партыйнымі цэнтрамі — усё гэта прывяло да таго, што бальшавікі на месцах паддаліся аб'яднаўчым настроям, зрабіўшы тым самым вялікую памылку. Жыццё паказала, што апартунізм меншавікоў — не выпадковасць, не проста памылкі шукаючых ісціну людзей, а заканамерная сацыяльна абумоўленая з'ява. Маючы такія недахопы, як разрыў слова і справы, гістарычны фаталізм, хранічнае адставанне ад рэвалюцыйнага руху мас, прыхільнасць да тэарэтычных шаблонаў, меншавікі пасля Лютаўскай рэвалюцыі ўсё больш крута зварочвалі ўправа. Яны перайшлі да класавага супрацоўніцтва з буржуазіяй, заклікалі рабочых устрымлівацца ад барацьбы за свае класавыя інтарэсы, а ўсе намаганні накіраваць на замацаванне ўжо дасягнутых палітычных заваёў. У гэтым жа фарватэры ішлі бундаўцы. Мала чым адрознівалася пазіцыя партыі эсэраў. Па меры абвастрэння класавай барацьбы і развіцця рэвалюцыі раслі рознагалоссі ўнутры аб'яднаных арганізацый. Рашаючае значэнне для пераадолення аб'яднаўчых настрояў мелі Красавіцкія тэзісы Леніна і Сёмая Усерасійская (Красавіцкая) канферэнцыя РСДРП(б). З гэтага часу пачаўся працэс інтэнсіўнага распаду аб'яднаных арганізацый. Разам з бальшавікамі гэтыя арганізацыі пакідаюць многія меншавікі-інтэрнацыяналісты. У Віцебску разрыў са згоднікамі-абаронцамі адбываецца ў чэрвені 1917 года. Адхіліўшы небяспечны лозунг адзінства з апартуністамі, бальшавікі губерні імкнуцца да аб'яднання толькі з рэвалюцыйнымі сацыял-дэмакратамі, якія на справе парвалі з меншавікамі-імперыялістамі і сталі на пазіцыі пралетарскага інтэрнацыяналізму, на платформу РСДРП(б). Першы арганізацыйны сход аб'яднаных камітэтаў інтэрнацыяналістаў і Віцебскай арганізацыі латышскіх сацыял-дэмакратаў (гэтая арганізацыя не ўваходзіла ў «аб'яднанку», дзейнічала самастойна і займала ленінскую пазіцыю) адбыўся 20 чэрвеня 1917 года. На ім прысутнічала 98 чалавек. Бальшавікі мелі перавагу. Іх на сходзе зарэгістравалася 59 чалавек. Аболін (мяркуючы па пратаколу — міжраёнец), які выступіў першым на сходзе з прамовай, прызнаў, што мясцовая

арганізацыя РСДРП колькасна вырасла і таму ўзнікла неабходнасць правядзення гэтага сходу. У Віцебску павінна быць заснавана аб'яднаная арганізацыя сацыял-дэмакратаў-бальшавікоў і меншавікоў-інтэрнацыяналістаў як сапраўдная абаронца інтарэсаў працоўных. Але на гэтым жа сходзе чуецца прамова і іншага плана: сацыяліст-рэвалюцыянер Лесін прапаноўваў падтрымаць палітыку наступлення на фронце. Ён заявіў, што «калі ж бальшавікі выкажуцца супраць наступлення, яны тым самым ўвядуць анархію ў арміі. Трэба весці вайну да пераможнага канца». Сход выбірае пагаджальную камісію, у якую ўключана чатыры бальшавіка (Барадаўскі, Пінсан, Чунчын, Шыфрэс), два міжраёнцы (Аболін, Бабун) і адзін меншавік-інтэрнацыяналіст (Туфрын). Перад ёй пастаўлена задача выпрацаваць платформу для аб'яднання. Па даручэнню сходу камісія прымае на сябе функцыі часовага камітэта [4]. Далейшыя дзеянні пераконваюць: у гэты час бальшавікі губерні настойліва адстойваюць свае пазіцыі. Яны разглядаюць адзінства рабочай справы, як адзінства марксістаў. Ідучы на збліжэнне з меншавікамі-інтэрнацыяналістамі, адхіляюць усялякія адступленні ад класавай барацьбы. Пазней, калі на пасяджэнні пагаджальнай камісіі, а затым на агульным сходзе, адзін з міжраёнцаў прапанаваў наладзіць сувязь з Петраградскім міжраённым камітэтам, бальшавікі адхілілі яго прапанову і настаялі на прыняцці рашэння аб устанаўленні пастаяннай сувязі з ЦК РСДРП(б). Як цяпер вядома, цесная сувязь з ЦК РСДРП(б) была ўстаноўлена. Дэлегатам ад Віцебскай арганізацыі РСДРП (інтэрнацыяналістаў) на VI з'ездзе партыі быў А. Берасцень, у якасці госця на ім прысутнічаў Б. Брэслаў. (Некаторыя аўтары лічаць яго дэлегатам з'езда). 2 ліпеня 1917 года на агульным сходзе інтэрнацыяналістаў выбіраецца аб'яднаны камітэт у складзе 9 членаў і 4 кандыдатаў. У члены камітэта выбраны Аболін, Берасцень, Барадаўскі, Далгашоў, Пятроў, Пінсан, Тайноў, Чунчын, Шыфрэс, у кандыдаты — Бітэ, Дзірык, Лятошка, Цемах. Важна адзначыць: у наяўнай літаратуры па гісторыі бальшавіцкай арганізацыі Віцебскай вобласці, відаць, па прычыне нейкай памылкі, выбранай у гэты камітэт лічыцца С. А. Шэйдліна, у той жа час адсутнічае прозвішча Барадаўскага. Аналіз многіх крыніц, у тым ліку і арыгінала пратакола данага сходу [5] паказвае, што Шэйдліна сапраўды прымала актыўны ўдзел у рабоце арганізацыі інтэрнацыяналістаў, але ў камітэт яна была выбрана праз два месяцы пасля гэтага сходу.

Аб'яднаны камітэт Віцебскай арганізацыі РСДРП (інтэрнацыяналістаў) пачынае наладжванне партыйнага ўліку. У пачатку ліпеня прымаецца рашэнне аб правілах прыёму ў партыю, аб вырабе членскіх картак і партыйных членскіх узносах. У канцы чэрвеня 1917 года сфарміравалася Полацкая арганізацыя РСДРП (інтэрнацыяналістаў). У той жа час да самай восені 1917 года зацягнулася суіснаванне ў адной арганізацыі з абаронцамі бальшавікоў Оршы.

Назву РСДРП (інтэрнацыяналістаў) Віцебская партыйная арганізацыя насіла да 15 верасня 1917 года. І толькі ў гэты дзень было прынята рашэнне прэзідыума камітэта інтэрнацыяналістаў аб тым, што за аснову дзейнасці прымаецца Статут партыі, выпрацаваны на VI з'ездзе РСДРП(б), і, што ў сілу гэтага, «наша арганізацыя надалей павінна называцца Віцебская арганізацыя РСДРП (бальшавікоў)» [6].

Адзначым, што і тут амаль уся наяўная навуковая і папулярная літаратура, у тым ліку Беларуская Савецкая энцыклапедыя і энцыклапедычны даведнік «Віцебск», што нядаўна выйшаў, маюць недакладнасць. Датай перайменавання Віцебскай арганізацыі ў РСДРП(б) яны называюць 13 верасня 1917 года. Да таго ж, часта асобныя аўтары, разглядаючы этапы станаўлення і развіцця Віцебскай і іншых партыйных арганізацый, даюць ім назву адвольна. У сувязі з гэтым хацелася б пажадаць усім, хто звяртаецца да «малой гісторыі», бачыць праходзячыя працэсы ў сукупнасці супярэчлівых тэндэнцый, што пераплятаюцца. Што ж тычыцца гістарычных асоб, дат, назваў палітычных плыняў, то тут патрабуецца шматразовая праверка, зварот да першакрыніц, супастаўленне наяўнага матэрыялу, поўная і верная іх класавая ацэнка.

Рэзка ўскладніліся ўмовы для работы Віцебскай арганізацыі РСДРП (інтэрнацыяналістаў) пасля падзей 3—5 ліпеня 1917 года. Мясцовыя карныя органы новага кааліцыйнага Часовага ўрада, якія падтрымліваліся меншавікамі і эсэрамі, адкрылі паход супраць рэвалюцыйных арганізацый. Асабліва праследаваліся члены РСДРП (інтэрнацыяналістаў). Іх абвінавачвалі ў шпіянажы, здрадзе, арыштоўвалі, не дапускалі да друку, да трыбуны.

Буржуазія не ўтойвала сваіх намераў. Яна ставіла задачу нацкаваць рабочых на бальшавікоў. Асабліва нападалі на інтэрнацыяналістаў Віцебска ў сувязі з выбарамі ў гарадскую думу. У жніўні 1917 года амаль у кожным нумары «Известий Витебских Советов крестьянских, солдатских и рабочих депутатов» друкуюцца матэрыялы, у якіх бальшавікоў абвінавачваюць у самых цяжкіх палітычных злачынствах, у авантурызме. 26 жніўня газета дала кампраметуючы матэрыял на перадвыбарную платформу інтэрнацыяналістаў, у якой яны справядліва запатрабавалі пераходу сродкаў вытворчасці ў рукі рабочых, перадачы зямлі сялянам рэвалюцыйным шляхам [7]. Узмацніць свае пазіцыі імкнуліся і партыі так званага «сацыялістычнага блоку» (меншавікі, бундаўцы, эсэры, энесы). Спекулюючы дэмакратычнымі лозунгамі, выкарыстоўваючы спрыяльныя ўмовы легальнай дзейнасці, створаныя для іх мясцовымі ўладамі, яны крывадушна абяцалі вырашыць надзённыя інтарэсы шырокіх народных мас. Іншы раз ім удавалася ашукаць працоўных. Напрыклад, у сярэдзіне ліпеня ў Віцебску на з'ездзе прадстаўнікоў прафесійнага саюза паравозных брыгад Рыжска-Арлоўскай чыгункі па патрабаванню меншавікоў і бундаўца была прынята рэзалюцыя, якая асуджала бальшавікоў-ленінцаў за ўзброенае выступленне ў Петраградзе 3—4 ліпеня. З'езд вітаў загад ваеннага міністра Керанскага аб арышце і адданні суду кіраўнікоў і ўдзельнікаў узброенага выступлення, адобрыў дзеянні Часовага ўрада. Як відаць, канстытуцыйныя ілюзіі яшчэ валодалі масамі, яныназіраліся нават у асяроддзі рабочага класа. Такія ілюзіі параджаліся і памылкамі, якія дапускаліся іншы раз самімі інтэрнацыяналістамі. Так, 20 ліпеня член аб'яднанага камітэта РСДРП інтэрнацыяналістаў Чунчын ставіць свой подпіс пад дакументам Віцебскага губернскага харчовага камітэта, у якім забараняецца самавольны захоп «чужых» зямель, у тым ліку і памешчыцкіх [8]. Палажэнні гэтага дакумента супярэчаць устаноўкам партыі на развіццё рэвалюцыі ў вёсцы.

Аднак у цэлым, нягледзячы на асобныя памылкі ў гэтыя рашаючыя для рэвалюцыі дні Віцебская арганізацыя інтэрнацыяналістаў дзейнічала дастаткова вытрымана, умела скарыстоўвала розныя метады работы ў масах, спалучаючы лягальныя і нелягальныя формы барацьбы. Умацоўвалася дысцыпліна і арганізаванасць членаў партыі. Рэгулярна (адзін, а то і два разы на тыдзень) праходзілі агульныя сходы арганізацыі, наладжана была дастаўка газет і лістовак з Петраграда і Масквы. На месцы перадрукоўваліся адозвы, лістоўкі, лозунгі. Была ўстаноўлена цесная сувязь з воінскімі часцямі, вытворчымі калектывамі [9].

Агітатары-бальшавікі Пінсан, Чунчын, Шэйдліна, Пятроў, Шыфрэс, Саркісьянц, Далгашоў і іншыя, нягледзячы на небяспеку апынуцца за кратамі, выступалі на сходах, мітынгах перад рабочымі, салдатамі, сялянамі. Сваім страсным, праўдзівым словам яны выклікалі абурэнне народа супраць часовага ўрада, партыі кадэтаў, выкрывалі памагатых контррэвалюцыі—дробнабуржуазныя партыі.

Паступова пад уздзеяннем самой рэчаіснасці, палітычнай работы Віцебскай арганізацыі інтэрнацыяналістаў дробнабуржуазныя ілюзіі, што назіраліся раней, рассейваліся, масы пераходзілі на бок рэвалюцыйнага пралетарыяту і яго авангарда. Аб вялікім давер'і мас у перадкастрычніцкія дні да рэвалюцыйнай партыі сведчаць вынікі выбараў: у Гарадскую думу Віцебскія сацыял-дэмакраты інтэрнацыяналісты атрымалі 16 месц: значна больш, чым кожная з уваходзячых у блок пагаджальных партый. Прыкметны стаў уплыў інтэрнацыяналістаў сярод рабочых фабрыкі «Дзвіна», чыгуначных майстэрань, іншых прадпрыемстваў. Цесныя адносіны ў інтэрнацыяналістаў склаліся з прафсаюзам металістаў, чыгуначнікаў, тэкстыльшчыкаў, гарбароў, карчомных рабочых і служачых. Члены інтэрнацыяналісцкай арганізацыі ўваходзілі ў іх праўленні, змагаліся за жыццяздольнасць прафсаюзаў, імкнуліся ачысціць іх ад меншавіцкай і эсэраўскай ідэалогіі, вучылі адгукацца на ўсе выпадкі дэспатызму, прыгнёту, змагацца супраць эканамічнага і палітычнага ўціску і беспраўя. Узмацніўся забастовачны рух рабочых. Неспакойна было ў салдацкіх казармах, у якіх знаходзілася прыкладна 40 тысяч чалавек. У іх ліку салдаты—рабочыя петраградскіх, рыжскіх заводаў, якія мелі грунтоўную класавую загартоўку [10].

Ацэньваючы вынікі разрыву бальшавікоў з дробнабуржуазнымі партыямі, іх аб'яднання з меншавікамі-інтэрнацыяналістамі і міжраёнцамі, можна адназначна гаварыць пра вялікі прагрэс у рэвалюцыйным руху губерні; створана самастойная палітычная арганізацыя рабочага класа. Распыленасць адзіночак была замацавана ідэйнай асновай і матэрыяльнай сілай арганізацыі, якая ўступіла на палітычную арэну пад бальшавіцкім

сцягам. Тым больш, што віцебскія меншавікі-інтэрнацыяналісты і міжраёнцы адкрыта прызналі стратэгію і тактыку ЦК РСДРП(б) на давядзенне рэвалюцыі да перамогі дыктатуры пралетарыяту. Недахопам жа руху варта прызнаць уступку, якую зрабілі бальшавікі сваім саюзнікам у вызначэнні назвы арганізацыі. Вядома, характар арганізацыі вызначаецца не столькі назвай, колькі зместам яе дзейнасці. Але, калі ўлічыць, што да таго часу ў свядомасці працоўных слова бальшавік замацавалася як паняцце «паслядоўны марксіст-рэвалюцыянер», да канца адданы справе рабочага класа, справе камунізму, то, несумненна, што ўзяўшы агульнапрынятую да таго часу назву РСДРП(б), Віцебская арганізацыя тым самым адразу прыцягнула б да сябе больш прыхільнікаў, узмацніла б свой уплыў на рабочых і працоўнае сялянства.

Слаба вывучаным пакуль з'яўляецца напрамак дзейнасці бальшавікоў у паветах і валасцях Віцебскай губерні. Мяркуючы па існуючых даных, з чатырох тысяч членаў РСДРП прыкладна чацвёртая частка падзяляла марксісцка-ленінскія погляды. Непасрэдна ў паветах каля 100 сацыял-дэмакратаў бальшавікоў рыхтавалі масы да будучых бітваў.

Так, крок за крокам надыходзіў час практычных дзеянняў: выканання рашэнняў VI з'езда РСДРП(б) аб правядзенні ўзброенага паўстання. Пралетарыят і працоўнае сялянства Віцебскай губерні, салдаты, расквартараваныя на яе тэрыторыі, трымалі раўненне на Петраград: там перш за ўсё вырашаўся лёс рэвалюцыі. Але працэс барацьбы за ўладу Саветаў быў адзіным, узаемазвязаным, калі поспех вядучага атрада пралетарыяту ў цэнтры аблягчаў, паскараў перамогу на месцах, а поспехі працоўных на месцах замацоўвалі заваяваныя пазіцыі ў цэнтры.

[1] Гл.: Ленін У. І. Творы. Т. 23. С. 286.
[2] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 49. С. 411.
[3] Гл.: Кнорин В. 1917 год в Белоруссии и на Западном фронте. Минск, 1925. С. 9.
[4] Партархіў Віцебскага АК КПБ. Ф. 10050, воп. 1, спр. 1, арк. 73.
[5] Там жа. Арк. 4, 23.
[6] Там жа. Спр. 2, арк. 33.
[7] Известия Витебских Советов крестьянских, солдатских и рабочих депутатов. 1917. 26 авг.
[8] Там жа. 1917. 20 июля.
[9] Красная быль. Витебск, 1923. С. 57, 62.
[10] Там жа. С. 198.

Е. Ф. САЎЧУК

## «АНТЫВАЕННЫ ТЫДЗЕНЬ» У БЕЛАРУСІ Ў СУВЯЗІ З 10-ГОДДЗЕМ З ПАЧАТКУ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Дзесяцігоддзе з пачатку першай сусветнай імперыялістычнай вайны V кангрэс Камінтэрна вырашыў адзначыць «Інтэрнацыянальным тыднем барацьбы супраць імперыялістычнай вайны і сацыял-здрадніцтва», які праводзіўся с 27 ліпеня па 4 жніўня 1924 года. Ён меў характар міжнароднай палітычнай акцыі супраць імперыялізму, росту мілітарызму і пагрозы вайны, у абарону міру. Як адзначалася ў пісьме выканкома Камінтэрна «Усім ЦК кампартый» ад 11 чэрвеня 1924 года, інтэрнацыянальны антываенны тыдзень праводзіўся з мэтай «падрыхтаваць масы да рашучай барацьбы супраць вайны; папулярызаваць думку аб неабходнасці пераўтварэння ўсялякай спробы імперыялістычнай вайны ў рэвалюцыйную, класавую вайну; падтрымаць усімі сродкамі і спосабамі Саюз Савецкіх Рэспублік у яго барацьбе за раззбраенне і мір; разгарнуць вялікую кампанію супраць занявольвання народаў Усходу». Адначасова ставілася задача выкрываць сацыял-здрадніцтва лідэраў II Інтэрнацыянала [1].

Гэты і другія дакументы, звязаныя з правядзеннем «антываеннага тыдня» адлюстроўваюць погляд на камуністычныя партыі як авангардную сілу антываеннага руху, на ролю СССР як фарпост міралюбівых сіл у барацьбе за раззбраенне і мір. Разам з гэтым у іх знайшоў адлюстраванне сектанцкі падыход да праблем міжнароднага антываеннага руху, які адсякаў ад удзелу ў сумесных антываенных акцыях тую частку рабочага класа, працоўных замежных краін наогул, якія знаходзіліся пад уплывам сацыял-дэмакратыі, ішлі за ёй. Базумоўна, сказалася і тое, што ў пачатку 1924 го-